МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ « Белінвестбанка »
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО « Белинвестбанка »
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

29.06.2020 № 6-7-4328э.

На № __________ ад ________________

(для информирования заинтересованных)

Аб разглядзе звароту

Мінгарвыканкам разгледзеў Ваш электронны зварот ад 27.05.2020 і на выкладзеныя ў звароце пытанні адказвае наступнае.

Прычынамі дэмантажу трохбаковых вулічных стэндаў грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя экспертаў і сюрвеераў на транспарце» з'явіліся: неналежны эстэтычны выгляд канструкцый, парушэнне аб'яднаннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб рэкламе.

У цяперашні час праводзіцца комплекс мерапрыемстваў па распрацоўцы фірмовага стылю горада Мінска.

Вынікі дадзеннай працы будуць улічаны для распрацоўкі схем пешаходнай турыстычнай навігацыі ў горадзе Мінску, укаранення сістэмы турыстычнай арыентыруючай інфармацыі пры рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная» на 2021-2025 гады.

У дачыненні да інфармацыі, размешчанай у метро, на падставе сведкаў ад дзяржаунага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн» паведамляем, што ў інфармацыйнай сферы прадпрыемства дзве дзяржаўныя мовы (беларуская і руская), вызначаныя артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія маюць раўназначнае выкарыстанне і прымяненне.

Акрамя таго, у інфармацыйную сферу працы метрапалітэна была ўведзена англійская мова ў сувязі з выданнем Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.01.2017 № 8 «Об установлении безвизового порядка въезда и выезда иностранных граждан» і атрыманымі рэкамендацыямі Мінгарвыканкама, з мэтай павышэння турыстычнай прывабнасці горада Мінска.

У цяперашні час у парадку прыярытэтаў выкарыстання:

трансляцыя аб'яваў моўнымі інфарматарамі на станцыях метрапалітэна ажыццяўляецца на рускай, беларускай і англійскай мовах;

трансляцыя аб'яў у вагонах рухомага складу ажыццяўляецца на беларускай, англійскай і рускай мовах;

перадача тэкстаў на інфармацыйных паказальніках выканана на беларускай і англійскай мовах (пры гэтым перадача геаграфічных назваў выканана шляхам іх транслітарацыі літарамі лацінскага алфавіту ў адпаведнасці з дзеючымі Законам Рэспублікі Беларусь ад 16.11.2010 № 190-З «О наименованиях географических объектов», Інструкцыяй па транслітарацыі геаграфічных назваў Рэспублікі Беларусь літарамі лацінскага алфавіту (далей – Інструкцыя), зацверджанай пастановай Дзяржаўнага камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь ад 13.11.2000 № 15 і рэкамендацыямі Тапанімічнай камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.10.2012 №5-2-4/7749. Дадзеная сістэма раманізацыі геаграфічных назваў адобрана ўдзельнікамі 10-й Канферэнцыі ААН па стандартызацыі геаграфічных назваў);

аб'явы для пасажыраў на інфармацыйных стэндах і налепках выкананы на рускай, беларускай і англійскай мовах;

найменні станцый метрапалітэна на пуцявых сценах нанесены на беларускай і рускай мовах;

размешчаная на станцыях і вагонах рухомага складу рэклама аформлена на рускай і беларускай мовах;

афіцыйны сайт прадпрыемства вядзецца на рускай мове;

схемы ліній метрапалітэна размешчаныя ў вестыбюлях усіх станцый і ў вагонах выкананыя на беларускай мове ў адпаведнасці з Інструкцыяй;

карты «Мінск і метрапалітэн асноўныя славутасці» выраблены на рускай мове, гэтак жа з выкарыстаннем QR-кода на англійскай мове.

Улічваючы выкладзенае, унясенне змяненняў у інфармацыю, размешчаную ў метрапалітэне, не плануецца.

На падставе прадстаўленай інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «МІНГАРДАВЕДКА» паведамляем, што звесткі на картаграфічнай прадукцыі «Падарожжа з Картай Госця», прадстаўлены ў выглядзе часткі карты горада Мінска з указаннем на ёй славутасцей сталіцы, размешчаных на дадзеным участку карты, якія з'яўляюцца аб'ектамі Карты Госця, і тлумачальнай інфармацыі да карты.

Тлумачальная інфармацыя да карты дадзена не аб элементах вулічна-дарожнай сеткі горада Мінска, а аб аб'ектах Карты Госця, якія прадстаўлены на частцы карты, і размешчана на рускай і англійскай мовах.

З улікам таго, што на англійскую мову перакладаліся не геаграфічныя назвы і не элементы вулічна-дарожнай сеткі горада Мінска, а аб’екты Карты Госця, памылкі ў транслітарацыі не дапушчаны і Інструкцыя не парушана.

Для забеспячэння беларускамоўных грамадзян патрэбнай ім інфармацыяй на беларускай мове, у далейшым пры перавыданні размешчанай картаграфічнай прадукцыі аб аб’ектах Карты Госця, а таксама пры далейшым яе складанні, ДП «МІНГАРДАВЕДКА» Ваша пажаданне будзе ўлічана і картаграфічная прадукцыя аб аб’ектах Карты Госця будзе дапоўнена інфармацыяй на беларускай мове.

Аб існуючай сістэме арыентавання ў горадзе Мінску Вам будзе паведамлена дадаткова.

Намеснік старшыні А.В.Дараховіч

Васільеў 292 08 20